| УЗГОДНЕНА: | УЗГОДНЕНА: |
| --- | --- |
| Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага гарадскога выканаўчага камітэта | Намеснік старшыні Пінскага гарадскога выканаўчага камітэта |
| ____________ В.М.Кулак | ____________ М.Ул. Кавалеўская |
| «_04_» _января_ 20_17_ г. | «_04_» _января_ 20_17_ г. |
| М.П. | М.П. |

# ПРАВІЛЫ
## карыстання бібліятэкамі Дзяржаўнай установы культуры «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

1. Правілы карыстання бібліятэкамі Дзяржаўнай установы культуры «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (далей – Правілы) распрацаваны ў адпаведнасці з «Тыпавымі правіламі карыстання бібліятэкамі ў Рэспубліцы Беларусь», зацверджанымі пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 05.08.2008 № 28.

2. У Правілах выкарыстоўваюцца тэрміны ў значэннях, устаноўленых Законам Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь».

3. Правілы рэгламентуюць узаемаадносіны карыстальнікаў і бібліятэкі ў працэсе бібліятэчнага, інфармацыйнага, даведачна-бібліяграфічнага і сацыякультурнага абслугоўвання.

4. Парадак карыстання бібліятэкамі, іх фондамі, пералік асноўных паслуг і ўмовы іх прадстаўлення ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, Палажэннем цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме г. Пінска, а таксама дадзенымі Правіламі.

5. Бібліятэка мае права ўносіць дапаўненні і змяненні ў Правілы карыстання ва ўстаноўленым парадку, вызначаць умовы карыстання бібліятэчнымі фондамі і іншымі інфармацыйнымі рэсурсамі, а таксама рэжым доступу да іх, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

6. Права на карыстанне бібліятэкамі мае любая фізічная асоба незалежна ад полу, узросту, нацыянальнасці, адукацыі, сацыяльнага палажэння, палітычных і рэлігійных перакананняў і прафесійнай прыналежнасці, а таксама любая юрыдычная асоба незалежна ад формы ўласнасці і ведамаснай падпарадкаванасці.

7. Карыстальнікі бібліятэк у адпаведнасці з індывідуальнымі патрэбамі і інтарэсамі маюць права на свабоднае і бясплатнае атрыманне асноўных паслуг бібліятэк, акрамя платных (дадатковых) паслуг.

8. Непаўналетнія асобы маюць права на бібліятэчнае, інфармацыйнае і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне ў дзіцячых і публічных бібліятэках, абслугоўваючых дзяцей.

9. Асобы з аслабленым зрокам і асобы, страціўшыя зрок, маюць права на бібліятэчнае, інфармацыйнае і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне і атрыманне дакументаў на спецыяльных носьбітах інфармацыі з фонду агучанай літаратуры пункта выдачы па абслугоўванню карыстальнікаў з парушэннем зроку пры цэнтральнай гарадской бібліятэцы.

10. Асобы, якія не могуць наведваць бібліятэкі па месцы жыхарства па прычыне пажылога ўзросту, абмежаваных фізічных магчымасцей, маюць права на нестацыянарныя формы абслугоўвання (абслугоўванне на даму і г.д.).

11. Доступ да інфармацыйных рэсурсаў можа быць абмежаваны на аснове заканадаўства Рэспублікі Беларусь і ў адпаведнасці з дакументамі, рэгламентуючымі дзейнасць бібліятэк.

**12. Карыстальнікі бібліятэк маюць права:**

12.1. Наведваць бібліятэкі ў адпаведнасці з рэжымам іх працы;

12.2. Бясплатна атрымліваць поўную інфармацыю аб саставе фондаў і інфармацыйных рэсурсах бібліятэк праз сістэму каталогаў, картатэк, базаў даных і іншыя формы бібліятэчнага інфармавання;

12.3. Бясплатна атрымліваць кансультацыйную дапамогу ў пошуку крыніц інфармацыі;

12.4. Атрымліваць у часовае карыстанне дакументы з фондаў бібліятэк на дом не больш 10 кніг і іншых крыніц інфармацыі тэрмінам на 1 месяц, а асабліва каштоўных, рэдкіх і выданняў павышанага попыту (вызначаюцца бібліятэчнымі спецыялістамі на аснове аналізу фондаў) – на 10 дзён;

12.5. Атрымліваць у часовае карыстанне дакументы з фондаў бібліятэк для работы ў чытальнай зале ў неабмежаванай колькасці;

12.6. Працягваць тэрмін карыстання дакументам пры ўмове прад'яўлення яго ў захаванасці і адсутнасці запытаў з боку іншых карыстальнікаў на гэты дакумент на 1 месяц, а асабліва каштоўныя, рэдкія і выданні павышанага попыту на 10 дзён;

12.7. Атрымліваць доступ да электронных інфармацыйных рэсурсаў у адпаведнасці з Правіламі;

12.8. Удзельнічаць у сацыякультурных мерапрыемствах, якія праводзяць бібліятэкі для карыстальнікаў;

12.9. Выкарыстоўваць у зонах абслугоўвання чытачоў тэхнічныя сродкі (фотаапараты і мабільныя тэлефоны) на аўтаномным забеспячэнні без гукавых сігналаў;

12.10. Карыстацца мабільнымі тэлефонамі па-за зонамі абслугоўвання чытачоў;

12.11. Звяртацца да прадстаўнікоў адміністрацыі бібліятэкі з прапановамі, заўвагамі, скаргамі па ўсіх пытаннях, якія датычацца абслугоўвання, набыцця і арганізацыі інфармацыйных рэсурсаў і паслуг;

12.12. Карыстацца іншымі відамі паслуг, у тым ліку платнымі, пералік якіх устаноўлены бібліятэкамі ЦБС і зацверджаны аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага гарвыканкама.

**13. Карыстальнікі бібліятэк абавязаны:**

13.1. Выконваць дадзеныя Правілы і прытрымлівацца рэжыму работы бібліятэк;

13.2. Беражліва адносіцца да бібліятэчных фондаў. Пры атрыманні дакументаў з якімі-небудзь дэфектамі карыстальнік павінен тэрмінова паведаміць аб гэтым бібліятэкару, які абавязаны зрабіць на іх адпаведныя адзнакі. У адваротным выпадку карыстальнік нясе адказнасць за выяўленую дэфектнасць;

13.3. Не выконваць дзеянні, якія наносяць шкоду дакументу (вырываць ці выразаць лісты, рабіць адзнакі і падкрэсліваць, калькаваць малюнкі і карты і г.д.);

13.4. Вяртаць дакументы ва ўстаноўлены бібліятэкамі тэрмін;

13.5. Працаваць на аўтаматызаваным рабочым месцы карыстальніка ў строгай адпаведнасці з Правіламі карыстання сеткай Інтэрнэт;

13.6. Беражліва адносіцца да маёмасці бібліятэк і абсталявання;

13.7. Праходзіць перарэгістрацыю чытачоў адзін раз у год у адпаведнасці з парадкам, устаноўленым бібліятэкамі: абавязкова прад’явіць чытацкі білет і пашпарт для ўдакладнення анкетных даных. Карыстальнікі, якія не прайшлі перарэгістрацыю, бібліятэкамі не абслугоўваюцца;

13.8. Інфармаваць аб змяненні пашпартных даных (прозвішча, месца жыхарства), нумароў тэлефонаў;

13.9. Здаваць у гардэроб верхнюю вопратку, сумкі, партфелі, пакеты, папкі і іншыя рэчы вялікіх памераў, музычныя інструменты ў футлярах, парасоны;

13.10. Прытрымлівацца грамадскага парадку і чысціні ў памяшканнях бібліятэк, паважаць правы іншых карыстальнікаў;

13.11. Мець акуратны знешні выгляд;

13.12. У надзвычайных сітуацыях (пажар, аварыя, пагроза тэрарыстычнага акта і інш.) выконваць патрабаванні супрацоўнікаў бібліятэк, органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях.

**14. Карыстальнікам бібліятэк забараняецца:**

14.1. Наведваць бібліятэкі ў стане алкагольнага, таксічнага, наркатычнага ап'янення;

14.2. Уваходзіць у бібліятэкі з жывёламі, за выключэннем карыстальнікаў – асоб з аслабленым зрокам і асоб, страціўшых зрок, – у суправаджэнні сабакі-павадыра;

14.3. Уносіць у бібліятэкі любыя друкаваныя выданні, дакументы на электронных і іншых носьбітах, рэжучыя, колючыя прадметы;

14.4. Выносіць дакументы з памяшкання бібліятэк без запісу ў формах уліку, прынятых бібліятэкамі;

14.5. Уносіць і выкарыстоўваць розныя капіравальныя прыборы (сканеры, аўдыя- відэаапаратуру);

14.6. Выкарыстоўваць мабільны тэлефон у зонах абслугоўвання чытачоў;

14.7. Перадаваць чытацкі білет іншым асобам або карыстацца білетам іншай асобы.

15. Для рэгістрацыі ў якасці карыстальніка бібліятэкай грамадзянін павінен прад'явіць пашпарт або іншы дакумент, які сведчыць асобу і рэгістрацыю ў горадзе (від на жыхарства, даведка аб часовай рэгістрацыі, ваенны білет з прыпісным пасведчаннем для ваеннаслужачых, вадзіцельскае пасведчанне). Паведаміць неабходныя звесткі для афармлення рэгістрацыйных форм, вызначаных (зацверджаных) бібліятэкамі, азнаёміцца з дадзенымі Правіламі і пацвердзіць згоду на іх выкананне асабістым подпісам.

16. Грамадзяне, якія не маюць пры сабе дакументаў, не зарэгістраваны ці часова пражываюць у г. Пінску (камандзіроўка, адпачынак і г.д.), маюць права карыстацца толькі паслугамі чытальных залаў бібліятэк.

17. Рэгістрацыйныя формы (чытацкі білет, фармуляр чытача) афармляюцца ў ручным або аўтаматызаваным рэжыме супрацоўнікамі бібліятэк у прысутнасці карыстальніка.

18. Рэгістрацыя непаўналетніх ва ўзросце да шаснаццаці гадоў у якасці карыстальнікаў бібліятэк праводзіцца са згоды бацькоў, законных прадстаўнікоў па прад'яўленні апошнімі пашпарта або іншага дакумента, які сведчыць асобу.

19. Рэгістрацыя непаўналетніх ва ўзросце ад шаснаццаці да васямнаццаці гадоў у якасці карыстальнікаў бібліятэк праводзіцца па асабістаму пашпарту пры яго наяўнасці.

***Заўвага.*** *Бібліятэкі абавязваюцца захоўваць канфідэнцыяльнасць звестак пра карыстальнікаў.*

20. Рэгістрацыя калектыўных карыстальнікаў (юрыдычных асоб) ажыццяўляецца на падставе дагавора, які вызначае парадак прадастаўлення інфармацыйна-бібліятэчных паслуг.

21. У тых выпадках, калі чытач бярэ кнігі для членаў сваёй сям'і, на кожнага з іх запаўняецца фармуляр чытача, на абароце якога член сям'і сваім подпісам даручае браць кнігі выбранай асобе.

22. Дарослыя карыстальнікі бібліятэкі і дзеці, пачынаючы з 4-х класаў, павінны ставіць подпіс за кожны атрыманы экзэмпляр выданняў. Чытачы 1-3-х класаў не распісваюцца. За чытачоў дашкольнага ўзросту подпіс у чытацкім фармуляры пакідаюць бацькі.

23. Чытацкі білет выдаецца за плату. У выпадку яго страты выдаецца дублікат чытацкага білета за плату. Пасля заканчэння тэрміна дзеяння чытацкага білета новы выдаецца за плату.

24. Запіс у бібліятэку, выдача бібліятэчных дакументаў і аказанне платных паслуг спыняюцца за 10 хвілін да яе закрыцця.

25. У выпадку страты, пашкоджання дакументаў з фондаў бібліятэк карыстальнікі замяняюць іх ідэнтычнымі, раўнацэннымі. Пры адсутнасці магчымасці замены дакументаў адміністрацыя бібліятэкі можа патрабаваць кампенсацыі прычыненых страт у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

25.1. За страту дакументаў з фондаў бібліятэк або нанясенне ім незаменнай шкоды непаўналетнімі чытачамі адказнасць нясуць іх бацькі або апекуны, папячыцелі, дзіцячыя ўстановы, пад наглядам якіх яны знаходзяцца.

26. Карыстальнікі бібліятэкі, якія нанеслі шкоду маёмасці бібліятэкі (камп'ютары, аргтэхніка, мэбля, электраабсталяванне і іншая маёмасць), кампенсуюць нанесеную шкоду ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

27. Карыстальнікам бібліятэк, якія парушылі тэрміны вяртання дакументаў з іх фондаў, наступная выдача дакументаў спыняецца да поўнага ўзаемаразліку па запазычанасці.

Дырэктар ДзУК «Пінская ГЦБС» Дз.А. Лагодзіч